ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (1002) ● ЧАЦВЕР, 15 лютага 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## *ДА ДНЯ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ*

## РЫХТУЕЦЦА КАНФЕРЭНЦЫЯ

У гонар 55-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту 21 лютага адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі. Рыхтуюць яе рэктарат, партком, ваенная кафедра, савет ветэранаў вайны і камітэт ЛКСМБ. Плануецца абмеркаваць наступныя даклады: «У. І. Ленін, КПСС аб выхаванні савецкай моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа», «Работа ваеннай кафедры БДУ па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі», «Формы, метады і сродкі ваенна-патрыятычнага выхавання», «Удзел ветэранаў вайны ў ваенна-патрыятычным выхаванні», «Дзейнасць камсамольскай арганізацыі БДУ па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў».

З паведамленнямі выступяць студэнты, аспіранты, выкладчыкі, супрацоўнікі бібліятэкі, кіраўнікі грамадскіх арганізацый БДУ.

**М. МАЦЕЙКА.**

## ВЕЧАРЫ, ЛЕКЦЫІ, ГУТАРКІ

З 14 па 23 лютага на факультэтах пройдуць урачыстыя сходы, прысвечаныя 55-й гадавіне Узброеных Сіл СССР, тэматычныя вечары, вечары-сустрэчы з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Лекцыі і гутаркі па ваенна-патрыятычнай тэматыцы адбудуцца ў групах і на курсах.

У гэтыя дні студэнты зробяць экскурсіі ў музеі, пабываюць у паходах па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы.

Па традыцыі выйдуць на спаборніцтвы стралкі.

Для студэнтаў і супрацоўнікаў будзе арганізаван паказ кінафільмаў па героіка-патрыятычнай тэматыцы.

Святочныя выпускі насценных газет прысвячаюцца гэтай знамянальнай даце.

**Л. КУЗНЯЦОВА.**

# АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## У РЭКТАРАЦЕ

Усебакова абмеркаван стан палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы ў студэнцкіх інтэрнатах. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў старшыня прафкома БДУ М. ДРОЗД, паведамлены вынікі праверкі універсітэцкіх інтэрнатаў, праведзенай у студзені.

Зрабіўшы аналіз традыцыйных форм работы з моладдзю ў інтэрнатах, М. Дрозд падкрэсліў значэнне агляду-конкурсаў і паведаміў вынікі апошняга—у гонар 50-годдзя ўтварэння СССР: першае месца прысуджана інтэрнату № 1, другое — інтэрнату № 4, трэцяе—інтэрнатам №№ 2, 3. На апошнім месцы інтэрнат № 7.

Агляд-конкурс паказаў, што там, дзе добра наладжана работа камендантаў і студсаветаў, паспяхова вядзецца палітыка-выхаваўчая і культурна-масавая работа. У інтэрнатах №№ 1,4 праводзяцца сустрэчы з вядомымі людзьмі рэспублікі, вучонымі, выкладчыкамі факультэтаў, літаратурна - музычныя вечары, лекцыі на міжнародныя тэмы, вечары адпачынку студэнтаў. У гэтых інтэрнатах добра аформлены ленінскія пакоі, чытальныя залы. У холах інтэрната № 4 зроблены стэнды, прысвечаныя У. І. Леніну, баявому шляху Савецкіх Узброеных Сіл. Рэгулярна ў інтэрнаце выпускаюцца насценныя газеты, арганізуюцца радыёперадачы, сістэматычна праводзяцца праверкі санітарнага стану. Многае робіцца для выхавання ў студэнтаў беражлівых адносін да сацыялістычнай маёмасці.

Адзначан станоўчы вопыт работы ў інтэрнатах дэканатаў і грамадскіх арганізацый гістарычнага, геаграфічнага, біялагічнага факультэтаў, факультэта журналістыкі і інш.

У гонар 50-годдзя ўтварэння СССР за лепшую арганізацыю працы, быту і адпачынку студэнтаў Рэспубліканскі камітэт прафсаюзаў узнагародзіў універсітэт першай грашовай прэміяй у размеры 500 рублёў.

Аднак у арганізацыі палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы ёсць яшчэ шмат недахопаў: не адпавядае сучасным патрабаванням наглядная агітацыя, а ў інтэрнаце № 7, дзе жывуць студэнты фізічнага і матэматычнага факультэтаў, яе зусім няма, чытальныя залы недастаткова забяспечаны мэбляй. У інтэрнаце № 3, дзе жывуць студэнты юрыдычнага факультэта, няма ні ленінскага пакоя, ні чытальных залаў. Не ва ўсіх інтэрнатах ёсць тэлевізары, радыёпрыёмнікі, радыёвузлы.

Пастанова рэктарата па гэтаму пытанню прадугледжвае цэлы комплекс мер, накіраваных на ліквідацыю адзначаных недахопаў.

* * *

На гэтым жа пасяджэнні даў справаздачу аб рабоце курсаў падрыхтоўкі рэзерву прапагандысцкіх кадраў для сістэмы партыйнай і камсамольскай асветы іх кіраўнік Э. М. Загарульскі. На курсы прыцягнута 390 студэнтаў трэцяга-чацвёртага курсаў усіх факультэтаў. Заняткі вядуць работнікі Мінскага абкома КПБ, Дома палітычнай асветы, вячэрняга універсітэта марксізму-ленінізму пры гаркоме КПБ, выкладчыкі ВПШ, навукова-педагагічныя супрацоўнікі універсітэта. Лекцыі праводзяцца рэгулярна, у пэўныя дні, на высокім палітычным і метадычным узроўні. Аднак трывогу выклікае наведванне заняткаў. Больш-менш здавальняючае становішча з групамі гістарычнага, юрыдычнага, матэматычнага факультэтаў і факультэта журналістыкі, нізкі працэнт наведвання слухачамі фізічнага факультэта і зусім не прыступілі да заняткаў студэнты хімічнага факультэта і ФПМ.

У пастанове па гэтаму пытанню звернута ўвага дэкана хімічнага факультэта Ф. М. Капуцкага і дэкана ФПМ Я. А. Іванова на нездавальняючую арганізацыю адбору слухачоў.

Намечана, пачынаючы з 1973-74 навучальнага года, арганізаваць на курсах падрыхтоўку прапагандыстаў - эканамістаў з ліку студэнтаў гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў.

На пасяджэнні рэктарата зацверджан план мерапрыемстваў па паляпшэнню прававой прапаганды і прававога выхавання студэнтаў.

## ФЕСТЫВАЛЬ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Працягваецца Усесаюзны фестываль савецкай моладзі, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР. Трэці, рашаючы год пяцігодкі юнакі і дзяўчаты адзначаюць поспехамі ў працы і вучобе, навуцы і спорце, дасягненнямі ў мастацтве.**

**У нашым раёне праводзяцца конкурсы на лепшае апавяданне, нарыс, паэму, верш аб маладым сучасніку, конкурс маладых выканаўцаў савецкай песні, на лепшы фотаздымак аб моладзі. Пераможцы конкурсу будуць узнагароджаны спецыяльнымі прызамі РК ЛКСМБ.**

## ДЗЕНЬ ВУЧОБЫ

Ва універсітэце ўведзен дзень вучобы кіруючага саставу (дэканаў факультэтаў, іх намеснікаў, загадчыкаў кафедр, начальнікаў аддзелаў і служб).

Вучоба праводзіцца раз у месяц (кожны другі панядзелак).

Першыя заняткі адбыліся 12 лютага. З лекцыяй аб працоўным заканадаўстве перад прысутнымі выступіў выкладчык юрыдычнага факультэта Я. М. Ануфрыеў.

## ПАРТКОМЕ

Наш універсітэт, які з'яўляецца членам Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў, падтрымлівае трывалыя сувязі з вну і навуковымі ўстановамі многіх замежных краін. Аб сутнасці гэтых сувязей далажыў на чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта загадчык аддзела па зарубежных сувязях С. С. Булычаў.

БДУ мае двухбаковыя дагаворы аб узаемнай садружнасці з Іенскім, Сафійскім і Люблянскім універсітэтамі, якія паспяхова выконваюцца. Нашы вучоныя прымаюць шырокі ўдзел у міжнародных навуковых канферэнцыях, сімпозіумах, семінарах. Шырока практыкуюцца навуковыя камандзіроўкі і стажыроўка спецыялістаў, абмен вопытам, вытворчая практыка студэнтаў на базе універсітэтаў-сяброў.

Толькі за пяць апошніх год у замежныя краіны было накіравана 259 навукова - педагагічных работнікаў і 520 студэнтаў. Прадстаўнікі БДУ наведалі ГДР, ПНР, Югаславію, Балгарыю, Кубу, Японію, Індыю, ЗША, Англію, Францыю, ФРГ, Швецыю, Канаду, Фінляндыю, Алжыр і інш. У нашым універсітэце з сацыялістычных і капіталістычных краін за гэты ж час пабывала 1006 вучоных, студэнтаў і членаў розных дэлегацый.

БДУ вядзе даволі шырокі абмен навуковай інфармацыяй, літаратурай; універсітэцкія вучоныя разам з замежнымі калегамі ўдзельнічаюць у аўтарскіх калектывах, якія рыхтуюць сумесныя выданні навуковых прац, вучэбных дапаможнікаў.

У гэтым годзе плануецца далейшае расшырэнне сяброўскіх сувязей. У Іенскі універсітэт будзе накіравана 11 вучоных, больш, чым у мінулым годзе, прадстаўнікоў БДУ выедзе ў Сафійскі і Люблянскі універсітэты. Расшырыцца і абмен студэнцкімі групамі (замест дзевяці—трынаццаць) для праходжання азнаямленча-вытворчай практыкі.

Больш будзе сумесных навуковых даследаванняў. Акрамя фізічнага, гістарычнага і геаграфічнага факультэтаў, у іх уключацца хімічны, філалагічны, біялагічны факультэты і асобныя кафедры.

Расшырыцца таксама кола універсітэтаў-сяброў.

На пасяджэнні размова ішла і аб недахопах: недастатковай эфектыўнасці некаторых паездак, недахопах індывідуальных планаў, праграм стажораў і практыкантаў і г. д.

У прынятай пастанове прапанавана навуковай частцы і аддзелу замежных сувязей, партыйным бюро і дэканатам факультэтаў, камітэту камсамола БДУ прыняць меры, каб ліквідаваць адзначаныя недахопы.

Галоўным рэдактарам серый «Весніка БДУ» рэкамендавана шырэй асвятляць у часопісе навуковыя сувязі БДУ з замежнымі краінамі.

* * *

На гэтым жа пасяджэнні разгледжана пытанне «Аб выкананні пастановы парткома «Аб рабоце партбюро АГЧ па захаванню сацыялістычнай маёмасці».

* * *

З інфармацыяй аб ходзе падрыхтоўкі да абмену партыйных дакументаў у партыйных арганізацыях НДІ прыкладных фізічных праблем, выдавецтва, філалагічнага факультэта выступілі тт. Лепо, Бараноўскі, Чубакоў.

## МЯСЦКОМЕ

Адбылася нарада старшынь вытворчых камісій прафсаюзных арганізацый факультэтаў і падраздзяленняў універсітэта, на якой абмяркоўвалася правядзенне сацыялістычнага спаборніцтва ў БДУ.

У адпаведнасці з рашэннем рэктарата, парткома, мясцкома, прафкома і камітэта камсамола аб правядзенні ва універсітэце сацыялістычнага спаборніцтва нарада распрацавала праект сістэмы паказчыкаў ацэнкі дзейнасці факультэтаў і агульнауніверсітэцкіх кафедр БДУ для вызначэння пераможцаў агульнауніверсітэцкага сацыялістычнага спаборніцтва. Копіі праекта дасланы ва ўсе пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі для абмеркавання з умовай, каб да 15 лютага ўсе заўвагі і прапановы, а таксама сацыялістычныя абавязацельствы былі прадстаўлены ў мясцком універсітэта. Па агульных даных будзе распрацавана палажэнне аб сацспаборніцтве ва універсітэце.

Але пакуль што абмеркаванне праекта сістэмы паказчыкаў ідзе вельмі марудна. Толькі інстытут прыкладных фізічных праблем і некалькі кафедр прадставілі ўсе матэрыялы. Нельга забываць, што у заўвагах да праекта сказана: за кожны дзень нясвоечасовага прадстаўлення ў мясцком матэрыялаў па сацыялістычнаму спаборніцтву з калектываў здымаецца 10 балаў.





*Для адных хваляванні экзаменацыйнай сесіі ужо ў далёкім мінулым: пацяснілі іх насычаныя цікавымі падзеямі вясёлыя канікулы. А для завочнікаў сесія — яшчэ свежы ўспамін.*

*НА ЗДЫМКУ: апошняя сустрэча з экзаменатарам. Для студэнта-завочніка VI курса аддзялення філасофіі У. М. КАРАГІНА яна, як і ўсе папярэднія ў зімовую сесію, была прыемнай.*

*Дацэнт І. А. Рабкоў ацаніў адказ студэнта на выдатна.*

Фота *Д. Чаховіча.*

# З УЛІКАМ ПЕРСПЕКТЫЎ

У КАСТРЫЧНІКУ сёлетняга навучальнага года савет БДУ абмеркаваў і зацвердзіў план мерапрыемстваў рэктарата і парткома па выкананню пастановы партыі і ўрада аб вышэйшай школе, які з'яўляецца цяпер практычным кіраўніцтвам для факультэта і яго кафедр у паўсядзённай дзейнасці і ў плане перспектыўнага развіцця. Якія ж пытанні і задачы ўжо ў цяперашні час вырашаюцца на факультэце?

Пачну з новых вучэбных планаў па дзённаму і вячэрняму навучанню па спецыяльнасцях агульная фізіка і радыёфізіка і фізічная электроніка. Яшчэ ў канцы мінулага вучэбнага года савет факультэта абмеркаваў праекты новых вучэбных планаў, па якіх ужо ў гэтым годзе пачалі займацца нашы першыя курсы. У новых вучэбных планах зроблен акцэнт на ўмацаванне агульнай тэарэтычнай падрыхтоўкі як па матэматычнаму, так і па фізічнаму цыклу дысцыплін.

Кафедра вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, напрыклад, перагледзела праграмы агульных курсаў, выпрацавала шэраг каштоўных метадычных указанняў, узгадніла свае курсы з курсамі фізічнага цыкла, г. зн. пабудавала лагічна цэльную сістэму выкладання вышэйшай матэматыкі для фізічных і радыёфізічных спецыяльнасцей, якая ўжо цяпер задавальняе патрабаванні новага вучэбнага плана. У агульным раздзеле курса вышэйшай матэматыкі вылучан у асобныя курсы шэраг дысцыплін, такіх, як дыферэнцыяльныя ўраўненні, вектарны і тэнзарны аналіз, тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка. Станоўчы вопыт работы гэтай кафедры і ў асаблівасці па метадычных пытаннях належыць перадаць і ўсім астатнім кафедрам.

У раздзеле курса агульнай фізікі перагледжаны суадносіны колькасці гадзін паміж асобнымі курсамі, умацаваны раздзелы курса тэарэтычнай фізікі. Уведзен шэраг новых спецыяльных курсаў і ў асаблівасці для спецыяльнасці фізічная электроніка, якія адпавядаюць узроўню сучаснага развіцця навукі па важнейшых яе напрамках. Гэта статыстычная радыёфізіка і тэорыя інфармацыі; тэорыя хвалевых працэсаў; метады рашэння прыкладных задач на ЭВМ; уводзіны ў спецыяльнасць; навуковае прагназіраванне (будзем чытаць у 10 семестры гэтага вучэбнага года). Курс агульная электроніка канкрэтызаваны і раздзелены на два курсы: вакуумная электроніка і электроніка ЗВЧ; фізіка паўправаднікоў і паўправадніковая электроніка.

Значная ўвага ў новых вучэбных планах удзелена грамадскім дысцыплінам і асаблівая ўвага—вывучэнню замежнай мовы.

Для кожнай спецыялізацыі ўнутры нашых спецыяльнасцей, ёсць свая група базавых курсаў, састаў і суадносіны якіх павінны сістэматычна перагледжвацца і карэкціравацца. Нашым спецыяльным кафедрам, якія забяспечваюць тую ці іншую спецыялізацыю, вельмі важна паўсядзённа быць у курсе спраў і перспектыў развіцця тых галін навукі і вытворчасці, якія чакаюць выпускніка. Толькі пры выкананні гэтых умоў падрыхтоўка спецыялістаў будзе адпавядаць патрабаванням вучэбнага плана і ўзроўню развіцця навукі і тэхнікі.

Сучасны этап камуністычнага будаўніцтва, які характарызуецца хуткімі тэмпамі развіцця вытворчых сіл, усебаковым навукова-тэхнічным і сацыяльным прагрэсам, прад'яўляе новыя, павышаныя патрабаванні да ўзроўню выхавання і адукацыі, яшчэ вышэй узнімае ролю савецкай вышэйшай школы ў жыцці нашага грамадства.

У плане выканання пастановы аб вышэйшай школе на нашым факультэце ўнутры спецыяльнасці радыёфізіка і фізічная электроніка ўжо з гэтага вучэбнага года пачнецца падрыхтоўка студэнтаў па спецыялізацыі мікраэлектроніка, якая вельмі неабходна і адпавядае патрабаванням і ўзроўню развіцця электроннай прамысловасці СССР. У прыватнасці, падрыхтоўка спецыялістаў па мікраэлектроніцы вельмі неабходна нашаму аб'яднанню «Інтэграл». З гэтага года і па 1980 год для прадпрыемстваў Міністэрства электроннай прамысловасці, адпаведна заключанаму дагавору, наш факультэт будзе рыхтаваць штогод 50 спецыялістаў па мікраэлектроніцы.

Кафедра фізікі паўправаднікоў і кафедра радыётэхнікі і фізічнай электронікі ўжо падрыхтавалі праграмы спецыяльных курсаў і лабараторый для гэтай спецыялізацыі. І ў гэтым вучэбным годзе з шостага семестра будзе выдзелена група па мікраэлектроніцы. Плануецца праводзіць падрыхтоўку па гэтай спецыялізацыі сумесна з вытворчым аб'яднаннем «Інтэграл». Здзяйсняцца яна будзе не толькі шляхам прыцягнення вядучых спецыялістаў вытворчасці для чытання курсаў, кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі работамі, але і з дапамогай арганізацыі вучэбных лабараторый непасрэдна на прадпрыемстве. Такая форма супрацоўніцтва ў поўнай меры адпавядае патрабаванням вытворчасці, узроўню развіцця тэхнікі і, безумоўна, садзейнічае павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

У плане перспектыўнага развіцця ядзернай энергетыкі ў Беларусі і рэспубліках Прыбалтыкі, патрабавання кадраў для гэтай галіны прамысловасці плануецца змяніць профіль спецыялізацыі па фізіцы цвёрдага цела ў напрамку матэрыялазнаўства. Такі напрамак не патрабуе вельмі вялікіх затрат па змяненню профілю кафедры, яе абсталявання, а наадварот, дазволіць выкарыстоўваць добра аснашчаную базу Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР па сумеснай падрыхтоўцы і выкарыстанні спецыялістаў гэтай спецыялізацыі.

Кафедрай ядзернай фізікі зроблены першыя крокі па ўмацаванню спецыялізацыі па біяфізіцы. Для чытання спецыяльных курсаў прыцягнуты буйныя спецыялісты з АН БССР, такія, як Конеў, Салаўёў і іншыя. Рыхтуецца стварэнне спецыяльных практыкумаў.

Вядзецца падрыхтоўчая работа для адкрыцця на факультэце новай аптычнай спецыяльнасці інжынернага профілю на базе існуючых дзвюх аптычных кафедр з перспектывай адкрыцця яшчэ адной кафедры — прыкладной оптыкі.

Пры рашэнні гэтых задач, на наш погляд, вельмі неабходна пры складанні праграм спецкурсаў, пераліку работ спецлабараторый разумна спалучаць характар, формы і змест палітыка-выхаваўчай і культурна-масавай работы са студэнтамі; выкарыстоўваць базу прамысловых прадпрыемстваў з мэтай распрацоўкі і прымянення сучасных навуковых метадаў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, а таксама тэхнічных сродкаў навучання.

Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» накладвае вялікую адказнасць на ўвесь калектыў нашага факультэта, партыйную, прафсаюзную і камсамольскую арганізацыі і патрабуе творчага выкарыстання ўсіх нашых рэзерваў.

**І. ЗЯЦЬКОЎ,**
**дэкан фізічнага факультэта.**

# ПЛЁН НАВУКОВЫХ ПОШУКАЎ





НАВУКОВА - ДАСЛЕДЧАЯ работа ў галіне беларускага мовазнаўства распачалася ва універсітэце з першых дзён яго заснавання. Распрацоўкай беларускай мовы спачатку тут займаліся такія вядомыя лінгвісты, як прафесар П. А. Бузук, дацэнты Я. В. Воўк-Левановіч, А. В. Багдановіч, пазней—прафесар Ц. П. Ломцеў, дацэнт М. І. Карнеева-Петрулан. На кафедры беларускай мовы універсітэта склалася традыцыя накіроўваць навуковыя пошукі на рашэнне першачарговых задач беларускай лінгвістыкі і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў філолагаў.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца стварэнню падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вышэйшай і сярэдняй школы, складанню і ўдасканаленню праграм курсаў беларускага мовазнаўства. У гэтай справе універсітэту як вядучай вышэйшай навучальнай і навукова-даследчай установе рэспублікі адводзіцца рашаючая роля. Супрацоўнікі кафедры нярэдка аб'ядноўваюцца з калектывамі іншых навучальных устаноў. Па сутнасці, усе найбольш важныя падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па дысцыплінах беларускага мовазнаўства, што з'явіліся ў пасляваенныя гады, ствараліся пры ўдзеле вучоных універсітэта.

За апошні час кафедрай падрыхтавана некалькі вучэбных дапаможнікаў па курсу сучаснай беларускай літаратурнай мовы: «Беларуская мова. Арфаграфія» дацэнта Я. М. Камароўскага, якая нядаўна выйшла другім, перапрацаваным выданнем, «Пунктуацыя беларускай мовы» і «Зборнік практыкаванняў па сучаснай беларускай мове. Сінтаксіс і пунктуацыя» дацэнта Л. І. Бурака, а таксама «Зборнік практыкаванняў па сучаснай беларускай мове. Лексікалогія, фанетыка, арфаэпія, графіка, арфаграфія» дацэнта І. М. Шчарбаковай. Пры вывучэнні раздзела аб фразеалагізмах карысным дапаможнікам можа з'явіцца «Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі», складзены дацэнтамі Е. С. Мяцельскай і Я. М. Камароўскім.

Е. С. Мяцельская ўдзельнічала ў стварэнні вучэбнага дапаможніка па беларускай дыялекталогіі, у якім паслядоўна, паводле існуючай праграмы для вну, асвятляюцца фанетычныя асаблівасці, лексіка і фразеалогія, марфалогія і сінтаксіс сучасных беларускіх гаворак, вызначаюцца іх дыялектныя разыходжанні і падзел на групы.

Упершыню ў практыцы вышэйшай школы на кафедры быў распрацаван курс гісторыі беларускай літаратурнай мовы, складзена праграма і выдадзена некалькі вучэбных дапаможнікаў па гэтаму курсу.

Для навучэнцаў завочных падрыхтоўчых курсаў пры універсітэце дацэнты У. М. Лазоўскі і І. В. Шадурскі выдалі вучэбна-метадычны дапаможнік «Беларуская мова».

Нельга не адзначыць і тое, што ў свой час на кафедры былі падрыхтаваны падручнікі беларускай мовы для сярэдняй школы дацэнтамі М. І. Жыркевічам і К. І. Шапялевічам. Па падручніку, які быў створан і затым удасканальваўся М. І. Жыркевічам, беларуская мова ў сярэдняй школе вывучалася амаль 30 гадоў.

Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі былі станоўча ацэнены навуковай грамадскасцю і заваявалі аўтарытэт сярод студэнцтва і ўсіх, хто карыстаўся імі.

Высокую ацэнку атрымалі і манаграфічныя даследаванні, выкананыя супрацоўнікамі кафедры, у прыватнасці «Назоўнік у беларускай мове. Частка І. Адзіночны лік» прафесара М. А. Жыдовіч.

Зараз у выдавецтвах «Вышэйшая школа» і універсітэта рыхтуюцца да друку вучэбны дапаможнік па курсу сучаснай беларускай літаратурнай мовы, адрасаваны яго аўтарам Л. І. Бураком спецыяльна студэнтам-завочнікам, а таксама вучэбна-метадычны дапаможнік па беларускай мове для падрыхтоўчых факультэтаў вну (аўтары— Е. С. Мяцельская і Я. М. Камароўскі), марфемны слоўнік беларускай мовы, у якім паказана марфемнае чляненне найбольш ужывальных слоў беларускай лексікі і які знойдзе прымяненне і ў вышэйшай, і ў сярэдняй школе на занятках па словаўтварэнню (складзены мною і дацэнтам Мінскага педагагічнага інстытута А. М. Бардовічам), і некаторыя іншыя працы.

Навукова-даследчая праблематыка, якою займаецца кафедра, ахоплівае актуальныя пытанні сучаснай беларускай літаратурнай мовы і яе гісторыі, беларускай дыялекталогіі і стылістыкі, кантактаў і ўзаемадзеяння беларускай мовы з іншымі мовамі на розных гістарычных этапах. Вось ужо некалькі гадоў калектыў супрацоўнікаў кафедры пад кіраўніцтвам М. А. Жыдовіч працуе над складаннем слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак, якія вылучаюцца ў тых адносінах, што з імі звязана моватворчасць нашых выдатных майстроў слова Я. Купалы і Я. Коласа. Вынікі гэтай вялікай работы публікуюцца ў асобных выпусках «Матэрыялаў да слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак». Л. І. Бурак заканчвае падрыхтоўку да друку манаграфіі, дзе будуць усебакова раскрыты своеасаблівыя сінтаксічныя канструкцыі, якія пашыраюцца ў моўным ужытку. Цікавымі і каштоўнымі для навукі маюць быць і іншыя даследаванні супрацоўнікаў кафедры.

Кафедра беларускай мовы ўсведамляе тую адказнасць, што ўскладзена на яе ў сувязі з апошнімі рашэннямі партыі і ўрада па далейшаму развіццю навукі ў вышэйшай школе, і прыкладзе ўсе намаганні, каб узняць ва універсітэце на больш высокі ўзровень навукова-даследчую работу ў галіне беларускага мовазнаўства.

**Л. ШАКУН,**
**прафесар, доктар філалагічных навук, загадчык кафедры беларускай мовы.**

**НА ЗДЫМКУ: ідзе пасяджэнне кафедры.**
**Фота Д. ЧАХОВІЧА.**

## У ВНУ КРАІНЫ

## ВЕЛІЗАРНАЕ БАГАЦЦЕ

*За 350 год свайго існавання (з 1608 г.) бібліятэка Львоўскага дзяржаўнага універсітэта сабрала звыш 2 млн 300 тысяч кніг, сярод якіх вельмі многа каштоўных, унікальных кніг розных выданняў. Самая старажытная кніга ў бібліятэцы — «Царкоўная гісторыя» Амвросія Медзяланскага, якая напісана на пергаменце—ў XII стагоддзі ў Італіі. У бібліятэцы захоўваецца рукапіс Ф. Пятраркі «Аб памятных рэчах», адзін з самых старажытных у нашай краіне гербарыяў, рукапісы дакументальнага характару.*

*Другую групу складаюць кнігі, надрукаваныя ў XV—XVIII стагоддзях, а трэцюю — рэдкія выданні, у асноўным гуманітарнага напрамку—першыя выданні Т. Мора, Т. Кампанелы, «Капітал» К. Маркса, каштоўныя фотарэпрадукцыі з унікальных рукапісаў і друкаваных кніг.*

## У БІБЛІЯТЭЦЫ БДУ

## НОВЫЯ КНІГІ ПА МАТЭМАТЫЦЫ

**1. Вагнер, Г. Основы исследования операций. В 3-х т. Пер. с англ., т. I, М., «Мир», 1972.**

**2. Исследования по современным проблемам суммирования и приближения функций и их приложениям. Сборник научных работ. Днепропетровск, 1972.**

**3. Каргаполов, М. И. и Мерзляков, Ю. И. Основы теории групп. М., «Наука», 1972.**

**4. Като Тосио. Теория возмущений линейных операторов. Пер. с англ. М., «Мир», 1972.**

**5. Китайгородский, А. И. Невероятно — но факт. М., «Молодая гвардия», 1972.**

**6. Кокорин, А. И. и Копытов, В. М. Линейно упорядоченные группы. М., «Наука», 1972.**

**7. Международный конгресс математиков. Ницца. 1970. Доклады советских математиков. М., «Наука», 1972.**

**8. Методика математики, элементарная математика, высшая алгебра, прикладная математика. Сборник трудов. Под ред. проф. И. К. Андронова. М., 1972.**

**9. Теория функций комплексного переменного и краевые задачи. Сборник статей. Вып. I. Чебоксары, 1972.**

**10. Шварц, Лоран. Анализ. Перевод с франц., т. 1—2. М., «Мир», 1972.**

Мае настаўнікі

# ЖЫЦЦЁ—СЛУЖЭННЕ ЛЮДЗЯМ



Пётр Іванавіч Альсмік. Нельга ўявіць сабе беларускую бульбу без Пятра Іванавіча. Яго імя вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.

Цяжкім быў яго шлях у навуку. Сын селяніна, ён у 1929 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Цяпер Пётр Іванавіч Альсмік — вядучы селекцыянер-бульбавод.

Ён — удзельнік дзвюх войн. Змагаўся на Фінскім фронце, вызваляў Заходнюю Беларусь. У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху ў Беларусі.

А ў мірны час усе помыслы былі аддадзены навуцы. У 1953 годзе пры абароне кандыдацкай дысертацыі яму была прысуджана вучоная ступень доктара сельскагаспадарчых навук. У 1956 годзе ён быў выбран членам-карэспандэнтам ВАСГНІЛ, а ў 1966 годзе — акадэмікам Акадэміі навук БССР.

Гэта ім выведзены многія сарты бульбы: «аграномічны», «заазерскі», «скараспелка-2», «лошыцкі», «тэмп», «разварысты», «беларускі», «крухмалісты», «старт». Усяго сартамі, якія выведзены Альсмікам і яго супрацоўнікамі, занята 307,6 тыс. га ў Беларусі, што складае 61,6 працэнта ад агульнай плошчы пасеваў бульбы ў БССР.

Партыя і ўрад высока ацанілі заслугі вучонага. У 1951 годзе яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія. У 1958 годзе ён узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. За выдатныя заслугі ў галіне селекцыі бульбы 30 красавіка 1966 года яму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». Пётр Іванавіч узнагароджан многімі залатымі і сярэбранымі медалямі ВДНГ.

Не толькі выдатны вучоны, але і цудоўны настаўнік, ён выхаваў цэлую плеяду селекцыянераў — сваіх паслядоўнікаў. Працавітасць гэтага чалавека выклікае глыбокую павагу. Ён шмат працуе, шмат піша, чытае. І нават незадаволен двума выхаднымі ў тыдзень. Для яго іх і няма. На свае доследныя дзялянкі ён ходзіць і ў будні і ў выхадныя. Накіроўваецца ранкам са словамі: «Пайду паздароўкаюся са сваёй бульбачкай». А поле не блізка — чатыры-пяць кіламетраў. І ўвесь шлях пехатой, растлумачваючы гэта так: «Калі іду, я думаю».

Пётр Іванавіч — чалавек вельмі добры, сціплы. Яго сардэчная, прыветная ўсмешка выклікае ў людзей такую ж цеплыню. Яго вельмі любяць і паважаюць і супрацоўнікі інстытута, і рабочыя.

Мэта ўсяго жыцця вучонага — служыць людзям, грамадству. Ён марыць вывесці самы лепшы, самы смачны сорт бульбы.

У доме П. І. Альсміка вельмі вялікая, багатая бібліятэка. Там ёсць усё: ад поўнага Збору твораў У. І. Леніна і Вялікай Савецкай Энцыклапедыі да навейшых выданняў навуковай і мастацкай літаратуры. А колькі перадаў ён літаратуры ў якасці дара бібліятэцы БНДІКПО і бібліятэцы доследнай гаспадаркі «Русінавічы»! Яго падпіска складае 24 назвы. Сярод кніг шмат грамадска-палітычнай, навуковай, зарубежнай літаратуры.

Я ведаю Пятра Іванавіча каля 10 гадоў. Мяне заўсёды прыцягвала яго прастата, дабрата ў адносінах да людзей. А як многа ён ведае! У яго можна атрымаць адказ на любое пытанне з галіны навукі, тэхнікі, палітыкі.

Незвычайна чуллівая яго любоў да жывёл, і яны яму плацяць тым жа.

Яшчэ калі я вучылася ў школе, Пётр Іванавіч быў частым госцем у нас. У размове з намі, вучнямі, ён заўсёды завастраў увагу на тым, што ў наш час маладому пакаленню трэба шмат ведаць, трэба любіць працу, бо іменна ёю прыгожы наш савецкі чалавек.

Мне здаецца, нам, студэнтам біялагічнага факультэта, пашанцавала. Праходзячы практыку ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце бульбаводства і плодагароднінаводства, мы маем магчымасць быць побач з гэтым выдатным вучоным, цудоўным чалавекам.

**А. ШЫПЯЛЬКЕВІЧ,**
студэнтка.

# Калі закончыліся лекцыі

**КАЛІ-НЕБУДЗЬ** у танцавальнай зале з-за нечага пляча паглядзіце на твары танцуючых: іх пранізвае нейкае напружанне, няма «разняволення», толькі зрэдку мільгане вясёлая, непасрэдная ўсмешка дзяўчыны, хлопца.

Прама насупраць мяне то з'яўляецца, то знікае нерухомы твар студэнта. Ну, абсалютна ніякіх эмоцый! Вочы то заплюшчваюцца, то расплюшчваюцца настолькі, каб бачыць святло і не зусім страціць з поля зроку партнёршу. Галава лялькі, якую тузаюць за ногі, ды і толькі. Нямала такіх на танцах: падкрэслена абыякавых, пагардлівых, знешне спакойных, а ўсё ж такі вельмі скаваных.

Многія з нас, пабываўшы на факультэцкім або агульнауніверсітэцкім вечары, застаюцца незадаволенымі. Часта мы і не прызнаёмся сабе ў гэтым. Ну, прыйшлі на некалькі гадзін адпачыць, патупалі нагамі на квадрацыку падлогі і разышліся.

Чаму танец, адзін са спосабаў выяўлення цудоўнай сутнасці чалавечай, ператвараецца ў бязрадаснае, манатоннае тупанне і шарканне!! Чаму ў танга, шэйку, твісце мы такія непрыгожыя, раўнадушныя! Я пыталася ў пастаянных наведвальнікаў вечароў, што іх больш за ўсё прыцягвае там. «Ходзім пазнаёміцца», — адзін адказ. «Любім танцаваць», — адказваюць часцей. Але дазвольце не паверыць! Няўжо, калі чалавек што-небудзь любіць, ён можа быць такім! Хіба, калі любіш танцаваць, будуць рухі такімі расхлябанымі, непрыгожымі!

## ТАНЦАВАЦЬ? ПРЫГОЖА!

Але з якой бы мэтай мы ні хадзілі на танцавальныя вечары, мы там або танцуем, або падпіраем сцены. І агульную нашу зайздрасць выклікаюць тыя, хто добра танцуе. Але рэдкая пара бывае непасрэднай, радаснай у музыцы, у руху. У такіх і не трэба пытаца, чаму яны прыйшлі на танцы.

Мабыць, твар таго хлопца-ідала ўжо крайнасць, але ёсць і другое... Дзяўчына какетліва калыша галавой, заламвае рукі, зграбна выгібаецца, а ўсё роўна няма поўнай гармоніі, задавальнення. Усе яе старанні пайшлі на вытанчэнне ў прыгожых жэстах. І калі хлопец яшчэ не спакушаўся танцаваць (адгэтуль і яго напускная абыякавасць), то, гледзячы на такіх, як яна, і на сотні няўмела танцуючых, робіцца сумна. Не! Усё павінна быць інакш. Нам жа самім гэта не падабаецца.

Мы ўмеем здаваць экзамены, мы добра вучымся, многа чытаем, пішам навуковыя работы, якія атрымліваюць вышэйшыя катэгорыі, мы ўмеем арганізаваць паход, прачытаць лекцыю і зрабіць мноства іншых патрэбных і не вельмі патрэбных рэчаў.

Але ёсць такое, можа, для каго-небудзь дробязь, без чаго мы практычна не можам абысціся, — танцы. Яны не ўваходзяць у навучальны працэс, праграмай не прадугледжаны. Вечары — гэта не адзіная і не галоўная магчымасць адпачыць, але на іх хадзілі, ходзяць і будуць хадзіць, і месц у зале па-ранейшаму не будзе хапаць.

А як мы вучымся танцаваць! Ціхенька дзе-небудзь у вузкім коле прыяцель пакажа прыяцелю асноўныя рухі. Вось і ўся школа танцаў.

Мне здаецца, у стварэнні пры універсітэце школы бальнага танца няма нічога ненатуральнага і немагчымага. Ёсць жа ў нас спартыўныя секцыі, студэнцкі тэатр. Канешне, такія школы ёсць пры клубах, Палацы прафсаюзаў, але не многія туды пойдуць: нязручна па часу, далёка. А ў такую школу пры універсітэце пайшлі б абавязкова: гэта ж у сваім доме.

Мабыць, арганізаваць гэтую школу не так ужо і проста, але трэба. Трэба і танцам вучыць, як вучылі нас культуры мовы, правілам паводзін, вучаць культуры думкі. Трэба ж дзе-небудзь, калі-небудзь запоўніць той прагал, што пакінула сярэдняя школа. Няхай жа гэта будзе зроблена тут, у нашым універсітэце.

**Г. КАНАШЭВІЧ,**
студэнтка.

**У зале беларускага аддзялення Усесаюзнай гандлёвай палаты была арганізавана IX абласная выстаўка фотааматараў г. Мінска і Мінскай вобласці. З цікавасцю спыняліся наведвальнікі ля работ студэнта IV курса факультэта журналістыкі нашага універсітэта Віктара Жука. Арыгінальнасць сюжэта, цікавая кампазіцыя і выдатная якасць здымкаў далі Віктару магчымасць стаць дыпламантам выстаўкі.**

**Сёння мы прапануем увазе чытачоў некалькі работ В. Жука.**







- **У адным страі.**
- **Студэнцкі будаўнічы...**
- **У свеце прахожых.**

